Дадатак
да загаду галоўнага
ўпраўлення па адукацыі
Брэсцкага аблвыканкама
ад 09.02.2022 № 94

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. У адпаведнасці з планам работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь на 2022 год, загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 18 сакавіка 2019 года № 202 «Аб правядзенні рэспубліканскай акцыі «Я гэты край Радзімаю заву» (далей – Акцыя) з мэтай удасканалення дзейнасці ўстаноў адукацыі па грамадзянскім і патрыятычным выхаванні дзяцей і навучэнскай моладзі праз актыўнае ўключэнне іх ва ўсебаковае вывучэнне гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны малой радзімы ў 2022 годзе ў рамках Акцыі праводзяцца:

рэспубліканскі геалагічны конкурс;

рэспубліканскі конкурс «Па старонках Дзённіка вандроўніка»;

рэспубліканскі конкурс «Славутыя роды краю майго».

1.2. Арганізатарам правядзення конкурсаў Акцыі з’яўляецца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Арганізацыйнае і метадычнае забеспячэнне Акцыі ажыццяўляе Установа адукацыі «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства» (далей – Рэспубліканскі цэнтр).

1.3. Конкурсы праводзяцца ў чатыры этапы з вызначэннем пераможцаў і прызёраў:

першы этап (адборачны) – ва ўстановах адукацыі, у тым ліку ва ўстановах адукацыі абласнога, Мінскага гарадскога і рэспубліканскага падпарадкавання;

другі этап (адборачны) – раённы, у тым ліку для гарадоў, якія маюць раённае дзяленне; гарадскі;

трэці этап (адборачны) – абласны. На дадзеным этапе прымаюць удзел пераможцы і прызёры другога этапу;

чацвёрты (заключны) – рэспубліканскі. На дадзеным этапе прымаюць удзел пераможцы і прызёры трэцяга этапу, а таксама пераможцы і прызёры ўстаноў рэспубліканскага падпарадкавання.

1.4. Для правядзення конкурсаў Акцыі на кожным этапе ствараюцца арганізацыйныя камітэты (далей – аргкамітэты).

Аргкамітэт кожнага этапу:

забяспечвае арганізацыйнае і метадычнае суправаджэнне конкурсаў Акцыі;

даводзіць інфармацыю аб конкурсах Акцыі да ведама ўстаноў адукацыі;

вызначае месца і канкрэтныя даты правядзення адпаведнага этапу конкурсаў Акцыі, якія прадугледжваюць вызначэнне пераможцаў і прызёраў;

ажыццяўляе персанальны падбор складу журы конкурсаў Акцыі і зацвярджае яго ва ўстаноўленым парадку;

аналізуе і абагульняе вынікі конкурсаў Акцыі;

асвятляе ход падрыхтоўкі, правядзення і вынікі конкурсаў Акцыі ў сродках масавай інфармацыі.

У склад аргкамітэтаў могуць уваходзіць прадстаўнікі зацікаўленых дзяржаўных органаў і арганізацый, грамадскіх аб’яднанняў, устаноў адукацыі, сродкаў масавай інфармацыі, прадстаўнікі органаў самакіравання ўстаноў адукацыі і інш.

1.5. Для падвядзення вынікаў конкурсаў Акцыі на кожным этапе аргкамітэтам ствараецца журы, якое:

праводзіць ацэнку конкурсных работ (у завочнай і вочнай (пры неабходнасці) формах);

вызначае пераможцаў і прызёраў адпаведных этапаў конкурсаў Акцыі;

прадстаўляе пратаколы па выніках конкурсаў Акцыі ў адпаведныя аргкамітэты.

1.6. Удзельнікі конкурсаў Акцыі – асобныя навучэнцы, калектывы навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, прафесійна-тэхнічнай адукацыі, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў дзвюх узроставых катэгорыях: да 14 гадоў (уключна), ад 15 гадоў і болей, акрамя конкурсу п. 2.1.

**2. Асаблівасці правядзення конкурсаў Акцыі**

**2.1. Рэспубліканскі геалагічны конкурс** (далей – конкурс) праводзіцца з лютага па сакавік 2022 года.

2.1.1. Асноўныя мэта і задачы конкурсу.

Конкурс праводзіцца з мэтай выхавання павагі да прыроднай спадчыны роднага краю і беражлівых адносін да яго багаццяў.

Асноўнымі задачамі конкурсу з’яўляюцца:

стварэнне ўмоў для развіцця геалагічнага руху сярод навучэнцаў;

выяўленне ведаў юных геолагаў, іх практычных уменняў і навыкаў самастойнай даследчай дзейнасці геалагічнай накіраванасці;

павышэнне прыродазнаўчага адукацыйнага ўзроўню адносна прыродакарыстання і экалагічнай бяспечнай жыццядзейнасці;

выяўленне навучэнцаў, якія матываваны на вывучэнне геалагічных дысцыплін на павышаным узроўні;

садзейнічанне прафесійнаму самавызначэнню.

2.1.2. Парадак правядзення конкурсу

У конкурсе прымаюць удзел асобныя навучэнцы установ агульнай сярэдняй адукацыі 8-11 класаў, навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах геалагічнай накіраванасці ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (не больш 2-х навучэнцаў ад установы).

Конкурс праводзіцца ў дыстанцыйным рэжыме ў адзін этап – рэспубліканскі, у два туры –адборачны і заключны.

Для ўдзелу навучэнцаў у конкурсе ўстановамі адукацыі да 11 сакавіка 2022 г. высылаюцца заяўкі з паметкай «геалагічны конкурс» на e-mail: krajaznaucy@mail.ru. Заяўка павінна змяшчаць: прозвішча, імя навучэнца, клас (аб’яднанне па інтарэсах), установа адукацыі, раён, вобласць, кантактны тэлефон кіраўніка.

Першы тур праводзіцца 17 сакавіка 2022 г. ў дыстанцыйнай форме. У першым туры навучэнцам неабходна выканаць тэставыя заданні, якія могуць уключаць пытанні з наступных раздзелаў: геалагічная будова Беларусі, геалагічнае летазлічэнне, тэктанічныя структуры краіны, геалагічныя працэсы фарміравання платформавага чахла Беларусі, фарміраванне платформавага чахла краіны ў розныя геалагічныя перыяды, генетычныя тыпы чацвярцічных адкладаў; мінералы і горныя пароды, карысныя выкапні Беларусі.

Тэставыя заданні выконваюцца навучэнцамі адначасова у прызначаны час, які будзе паведамлены ў дадатковай інфармацыі. Па заканчэнні часу праграма заблакіруе доступ да тэста. Па выніках першага тура, 50 навучэнцаў, якія набяруць вышэйшы бал, будуць адабраны для ўдзелу ў другім туры конкурсу.

Другі тур адбудзецца 28 сакавіка 2022 г. і будзе складацца з тэарэтычных (тэставых) і практычных заданняў. Пералік магчымых практычных заданняў: пабудова геалагічнага разрэзу ў маштабе карты; вызначэнне і апісанне ўзораў мінералаў і горных парод; вызначэнне выкапнёвых рэшткаў, іх геахраналагічнага ўзросту і асяроддзя пражывання; устанаўленне ўзаемасувязі паміж геалагічнай будовай, карыснымі выкапнямі і рэльефам Беларусі.

Інструкцыя па выкананні заданняў конкурсу першага і другога тураў будзе размешчана да 11 сакавіка 2022 г. на галоўнай старонцы сайта Рэспубліканскага цэнтра (http://rcek.by).

2.1.3. Пераможцы і прызёры конкурсу будуць вызначаны па суме балаў тэарэтычных і практычных заданняў другога тура.

Вызначана наступная колькасць прызавых месцаў: I месца – два, II месца – тры, III месца – чатыры.

2.1.4. У рамках конкурсу дадаткова праводзіцца рэспубліканская канферэнцыя «Мая будучыня – геалогія». Для ўдзелу ў канферэнцыі дасылаюцца навуковыя праекты навучэнцаў па даследаванні геалагічных асаблівасцей малой радзімы.

Праекты накіроўваюцца да 15 сакавіка 2022 г. ў электронным выглядзе на e-mail: krajaznaucy@mail.ru.

Журы папярэдне ацэньвае праекты і адбірае ўдзельнікаў канферэнцыі па наступных крытэрыях:

актуальнасць даследавання, тэарэтычная і практычная значнасць работы;

раскрыццё тэмы, у тым ліку, характарыстыка аб’екта даследавання, дадатковага фактычнага матэрыялу;

выніковасць даследавання.

Крытэрыі ацэнкі праектаў на канферэнцыі:

якасць даклада (паўната, лагічнасць прадстаўлення работы, аргументаванасць, мультымедыйнае суправаджэнне);

камунікатыўныя якасці;

адказы на пытанні (паўната, аргументаванасць, ступень валодання інфармацыяй у абранай тэме).

Удзельнікі канферэнцыі будуць вызначаны да 21 сакавіка 2022 г. Плануемая дата правядзення канферэнцыі 29 сакавіка 2022 г.

**2.2. Рэспубліканскі конкурс «Славутыя роды краю майго»** (далей – конкурс) праводзіцца з лютага па лістапад 2022 года.

2.2.1. Конкурс праводзіцца з мэтай фарміравання ў навучэнскай моладзі патрыятычных каштоўнасных арыенціраў, садзейнічання духоўнаму сталенню асобы, больш глыбокаму ўспрыманню нацыянальных гістарычных і культурных каштоўнасцей.

Асноўнымі задачамі конкурсу з’яўляюцца:

далучэнне навучэнцаў да даследавання знакамітых родаў краю, іх гісторыі ў асобах і справах, іх уплыву на тагачаснае палітычнае і (ці) сацыяльнае жыццё, укладу ў станаўленне дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі і (альбо) у культурна-гістарычную спадчыну;

папулярызацыя славутых родаў зямлі беларускай і астаўленых імі ў спадчыну гістарычных і культурных каштоўнасцей;

выхаванне беражлівых адносін да гісторыі і культуры краю, адказнасці за захаванне культурна-гістарычнай спадчыны славутых родаў;

фарміраванне вопыту даследчай пазнавальнай дзейнасці, развіццё гістарычнага мыслення, паглыбленне інтэлектуальнага патэнцыялу дзяцей і навучэнскай моладзі;

выяўленне і заахвочванне лепшых юных даследчыкаў – актыўных удзельнікаў конкурсу.

2.2.2. У рамках падрыхтоўкі і ўдзелу ў конкурсе навучэнцы праводзяць:

збор інфармацыі аб знакамітых родах сваёй мясцовасці (работа з навуковай, даведачнай літаратурай, архіўнымі дадзенымі, матэрыяламі інтэрнэт-рэсурсаў і інш.);

апытанне мясцовых жыхароў (пры неабходнасці);

даследаванне і аналіз сабранага матэрыялу;

афармленне конкурснага матэрыялу па выніках даследавання;

папулярызацыйную дзейнасць праз публікацыю ў сродках масавай інфармацыі, інтэрнэт-рэсурсах, правядзенне культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў і г.д.

2.2.3. Конкурс праводзіцца па намінацыях:

«Повязь часоў: лёсы ў гісторыі»;

«Нам засталася спадчына».

2.2.3.1. Намінацыя «Повязь часоў: лёсы ў гісторыі».

2.2.3.1.1. Удзельнікі конкурсу даследуюць знакамітыя роды малой радзімы – жыццё і дзейнасць прадстаўнікоў роду, іх уплыў на палітычны, культурны, эканамічны і сацыяльны лад тагачаснага грамадства, унёсак у станаўленне дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, у развіццё матэрыяльнай і духоўнай культуры краю; праводзяць геральдычныя і генеалагічныя даследаванні роду (паходжанне і роднасныя суадносіны), выяўляюць захаваныя да нашых дзён роднасныя сувязі (калі маюцца).

2.2.3.1.2. На конкурс прадстаўляецца даследчы матэрыял, які змяшчае:

гісторыю роду, жыцця і дзейнасці прадстаўнікоў роду ў адпаведнасці з п. 2.2.3.1.1.;

радаводныя дрэвы, расшыфроўку фамільных гербаў, генеалагічнае дасье, карты-схемы рассялення прадстаўнікоў роду;

кароткія гісторыка-культурныя звесткі аб мясцовасці ўкаранення знакамітых родаў (дзе знаходзілася (-цца) «радавое гняздо»);

выпіскі з пісьмовых крыніц, тэксты ўспамінаў (пры наяўнасці), фотаздымкі і іншыя матэрыялы, якія дапаўняюць і пацвярджаюць даследаванні;

прапановы па выкарыстанні звестак, атрыманых у ходзе даследавання, з мэтай папулярызацыі славутых родаў малой радзімы.

Асноўныя крытэрыі ацэнкі конкурсных матэрыялаў:

змястоўнасць, аналітычны падыход;

даследчыя навыкі, разважанні са спасылкай на крыніцы, уменне сістэматызаваць матэрыял і рабіць аргументаваныя высновы, выказваць свае адносіны да той ці іншай гістарычнай асобы, суадносіць сямейныя падзеі (роду) з пэўным гістарычным перыядам;

культурна-асветніцкая і папулярызацыйная дзейнасць.

2.2.3.2. Намінацыя «Нам засталася спадчына».

2.2.3.2.1. Удзельнікі конкурсу даследуюць культурна-гістарычную спадчыну, якую аставілі знакамітыя роды: заснаваныя імі мястэчкі, замкі, палацы, сядзібы, паркі, аб’екты рэлігійнай, эканамічнай і сацыяльнай культуры, тэатры, бібліятэкі, архіўныя зборы, друкарні, пісьмовыя

артэфакты (важныя дакументы, рукапісы, друкаваныя выданні), творы выяўленчага мастацтва і іншыя адметныя рэчы, а таксама традыцыі, звычаі, легенды і паданні, якія звязаны са славутым родам.

2.2.3.2.2. На конкурс прадстаўляецца даследчы матэрыял, які змяшчае:

звесткі аб даследуемых аб'ектах адпаведна п. 2.3.3.2.1. – сістэматызаванае і аргументаванае апісанне аб'ектаў у кантэксце гісторыка-культурнага развіцця тагачаснага грамадства (асноўных тэндэнцый і заканамернасцей) і наступных вех гістарычнага развіцця краю, стан і роля каштоўнасных вартасцей у грамадскім і культурным жыцці сённяшняга дня, выяву аб'ектаў, па магчымасці і па прынцыпу «раней-зараз»;

інфармацыю аб прадстаўніках роду, якія мелі (маюць) дачыненне да спадчынных каштоўнасцей;

апісанне радавых традыцый, звычаяў, легенд і паданняў;

выпіскі з крыніц, якія дапаўняюць і пацвярджаюць даследаванні;

прапановы па захаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей і выкарыстанні іх у мэтах развіцця рэгіянальнага турызму.

Асноўныя крытэрыі ацэнкі конкурсных матэрыялаў:

змястоўнасць, аналітычны падыход;

даследчыя навыкі, разважанні са спасылкай на крыніцы, уменне вылучаць галоўнае, сістэматызаваць матэрыял і рабіць аргументаваныя высновы;

уменне ацэньваць дасягненні матэрыяльнай і духоўнай культуры знакамітага роду з пункту гледжання нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей;

выказванне ўласнай пазіцыі адносна гісторыка-культурных з'яў мінулага славутых родаў, сваіх адносін да найбольш значных падзей і асоб;

культурна-асветніцкая і папулярызацыйная дзейнасць.

2.3.4. Конкурсныя матэрыялы пераможцы і прызёры рэгіянальных этапаў конкурсу і выпіскі з пратаколаў пасяджэння журы з указаннем колькаснага аналізу ўдзельнікаў дасылаюцца цэнтралізавана аддзеламі (упраўленнямі) па адукацыі гаррайвыканкамаў; індывідуальна – установамі адукацыі абласнога падпарадкавання на абласны этап **да 14 кастрычніка 2022 г.** на адрас: 224030, г.Брэст, праспект Машэрава, 22 (аддзел краязнаўства дзяржаўнай установы адукацыі «Брэсцкі абласны цэнтр турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі»). Тэлефон для даведак: (80162) 40-58-25, e-mail: kraevedbrest@mail.ru.

Электронныя варыянты работ прадастаўляюцца на конкурс у выглядзе файлаў, размешчаных на google-дыску. З гэтай мэтай каардынатары раённых/гарадскіх этапаў ствараюць агульны каталог на

google-дыску (назоў каталога павінен складацца з назвы конкурсу і раёна/горада), у які змяшчаюць работы, якія сталі пераможцамі і прызёрамі раённых/гарадскіх этапаў (назва файлаў павінна складацца з назвы намінацыі і ўстановы адукацыі). Спасылка на google-дыск высылаецца на электронную пошту аддзела краязнаўства kraevedbrest@mail.ru.

Не прымаюцца да ўдзелу:

1. працы, накіраваныя на паштовыя аддзяленні (без дастаўкі па адрасе дзяржаўнай установы адукацыі “Брэсцкі абласны цэнтр турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі”);

2. работы, накіраваныя індывідуальна ўстановамі агульнай сярэдняй адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

3. працы, афармленыя не належным чынам (афармленне тытульнага ліста альбо заяўкі без указання поўных кантактных дадзеных аўтара і кіраўніка; рэфератыўныя работы, а таксама работы, выкананыя ў чорна-белым афармленні).

Даследчыя работы не рэцэнзуюцца, захоўваюцца ў дзяржаўнай установе адукацыі “Брэсцкі абласны цэнтр турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі” на працягу 2 месяцаў пасля завяршэння рэспубліканскага этапа конкурсу.

**2.3. Рэспубліканскі конкурс «Па старонках Дзённіка вандроўніка»** (далей – конкурс) праводзіцца з лютага па снежань 2022 года.

2.3.1. Асноўныя мэта і задачы конкурсу.

Конкурс праводзіцца з мэтай фарміравання патрыятызму ў навучэнцаў праз іх далучэнне да актыўнай турысцка-экскурсійнай дзейнасці.

Асноўнымі задачамі конкурсу з’яўляюцца:

пашырэнне ведаў навучэнцаў аб гістарычнай, культурнай і прыроднай спадчыне роднага краю;

развіццё пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў і іх творчых здольнасцей;

удасканаленне сістэмы турысцка-экскурсійнай работы ва ўстановах адукацыі, развіццё адукацыйнага турызму.

2.3.2. Парадак правядзення конкурсу.

У конкурсе прымаюць удзел навучэнцы агульнай сярэдняй адукацыі ў двух катэгорыях: 1-4 класы, 5-11 класы.

Навучэнцы індывідуальна (у суправаджэнні законных прадстаўнікоў непаўналетняга) або ў складзе экскурсійных груп удзельнічаюць у экскурсіях/паходах, запаўняюць Дзённік вандроўніка (далей – Дзённік), у якім фіксуюць наведаныя аб’екты гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны нашай краіны.

Дзённік запаўняецца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі, якія размешчаны на сайце Рэспубліканскага цэнтра (https://rcek.by/Турысцка-экскурсійная работа).

Конкурсная работа складаецца з Дзённіка і творчай работы па адной з намінацый.

Пры ацэнцы Дзённіка ўлічваецца наяўнасць наступных паказчыкаў:

колькасць экскурсій/паходаў, у якіх прынялі ўдзел навучэнцы (ад 1 да 5);

паўната запаўнення табліц (па экскурсіях/паходах, якія здзейснілі навучэнцы);

выкананыя заданні (для навучэнцаў II і III ступеняў адукацыі, якія размешчаны ў канцы Дзённіка);

адзнакі аб наведванні экскурсійных аб’ектаў;

спасылкі на фотаздымкі (фотаздымкі павінны быць зроблены на фоне аб’ектаў і мець подпіс: дата, назва аб’ектаў, мясцовасць);

запіс, які зроблены падчас ці пасля экскурсіі/паходу (разварот Дзённіка «Для заметок/Мои впечатления»).

Таксама будзе ацэньвацца афармленне, граматнасць і акуратнасць запаўнення Дзённіка.

Творчыя работы прадстаўляюцца ў намінацыях «З алоўкам у вандроўку», «Убачанае ў пікселях».

2.3.3. Намінацыя «З алоўкам у вандроўку».

У намінацыі прадстаўляецца творчая работа інфармацыйна-публіцыстычнага жанру ў выглядзе нататкі адной з экскурсіі/паходу: аповед аб падзеях, уражаннях, назіраннях, сустрэчах з цікавымі людзьмі. Матэрыял павінен змяшчаць: завязку (пачатак падзеі), развіццё дзеянняў (апісанне канкрэтных дзеянняў, якія адбыліся падчас экскурсіі/паходу), кульмінацыю (найбольш цікавы, яркі момант у экскурсіі/паходзе), развязку (уражанні, якія засталіся пасля экскурсіі/паходу).

Конкурсныя работы прадстаўляюцца ў надрукаваным і электронным выглядзе, памер тэксту не павінен перавышаць 6000 знакаў (з прабеламі, шрыфт Times New Roman 14 пт, міжрадковы інтэрвал – 1,5). Матэрыял павінен мець тытульную старонку з указаннем вобласці, раёна/горада, поўнай назвы ўстановы адукацыі, назвы матэрыялу, прозвішча, імя (без скарачэнняў), узросту (клас) аўтара работы; прозвішча, імя, імя па бацьку (без скарачэнняў), пасады і кантактнага нумара кіраўніка работы. Пажадана да матэрыялу, напісанага на рускай мове, уключаць тытульную старонку на беларускай мове. Ілюстраванне конкурсных работ аўтарам не забараняецца.

Асноўныя крытэрыі ацэнкі конкурсных матэрыялаў:

адпаведнасць умовам і патрабаванням конкурсу;

змястоўнасць (адпаведнасць зместу назве матэрыялу, паўната раскрыцця, арыгінальнасць задумы);

адлюстраванне ў матэрыяле аўтарскай пазіцыі (самастойныя і абгрунтаваныя меркаванні, адпаведнасць зместу ўзросту аўтара);

адпаведнасць жанру (нататка);

граматнасць;

арыгінальнасць дызайну.

2.3.4. Намінацыя «Убачанае ў пікселях».

Удзельнікі конкурсу наведваюць падчас экскурсіі/паходу памятныя мясціны, робяць якасныя фотаздымкі/фотаздымак, відэазамалёўкі на любы лічбавы носьбіт (фотаапарат, тэлефон, камера) і размяшчаюць у сацыяльных сетках з хэштэгамі #рцэкРБ #конкурс #дзённік_вандроўніка. Візуальны матэрыял дапоўняецца кароткім апісаннем зафіксаванай падзеі (свабодная форма апісання з указаннем месцазнаходжання, маршруту экскурсіі/паходу і т.д.; дапускаецца выкарыстанне мастацкіх прыёмаў).

Асноўныя крытэрыі ацэнкі конкурсных матэрыялаў:

арыгінальнасць ідэі і кампазіцыйнага рашэння;

якасць фотаздымка/фотаздымкаў, відэазамалёўкі (выразнасць, яснасць);

арыгінальнасць апісання (без перагружанасці інфармацыяй);

папулярнасць дадзенага поста ў сацыяльных сетках.

Для ацэнцы дадзенай намінацыі прадстаўляецца спасылка на пост у сацыяльных сетках.

2.4. Конкурсныя матэрыялы пераможцаў рэгіянальных этапаў конкурсу і выпіскі з пратаколаў пасяджэння журы з указаннем колькаснага аналізу ўдзельнікаў дасылаюцца на абласны этап цэнтралізавана упраўленнямі (аддзеламі) па адукацыі гаррайвыканкамаў; індывідуальна – установамі адукацыі абласнога падпарадкавання **да <u>7 лістапада 2022 г.</u>** на адрас: 224030, г.Брэст, праспект Машэрава, 22 (аддзел краязнаўства дзяржаўнай установы адукацыі «Брэсцкі абласны цэнтр турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі»). Тэлефон для даведак: (80162) 40-58-25, e-mail: kraevedbrest@mail.ru.

Электронныя варыянты гульняў прадастаўляюцца на конкурс у выглядзе файлаў, размешчаных на google-дыску. З гэтай мэтай каардынатары раённых/гарадскіх этапаў ствараюць агульны каталог на google-дыску (назоў каталога павінен складацца з назвы конкурсу і раёна/горада), у які змяшчаюць тэкставыя апісанні і праекты, якія сталі пераможцамі і прызёрамі раённых/гарадскіх этапаў (назва файлаў павінна складацца з назвы намінацыі і ўстановы адукацыі). Спасылка на google-дыск высылаецца на электронную пошту аддзела краязнаўства kraevedbrest@mail.ru.

Не прымаюцца да ўдзелу:

1. працы, накіраваныя на паштовыя аддзяленні (без дастаўкі па адрасе дзяржаўнай установы адукацыі “Брэсцкі абласны цэнтр турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі”);

2. работы, накіраваныя індывідуальна ўстановамі агульнай сярэдняй адукацыі і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

3. працы, аформленыя не належным чынам (афармленне тытульнага ліста альбо заяўкі без ўказання поўных кантактных дадзеных аўтара і кіраўніка; рэфератыўныя работы, а таксама работы, выкананыя ў чорна-белым афармленні).

Работы не рэцэнзуюцца, захоўваюцца ў дзяржаўнай установе адукацыі “Брэсцкі абласны цэнтр турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі” на працягу 2 месяцаў пасля завяршэння рэспубліканскага этапа конкурсу.

**3. Афармленне конкурсных работ.**

Конкурсныя работы павінны абавязкова мець тытульную старонку на беларускай і рускай мовах з пазначэннем поўнай назвы ўстановы адукацыі (без скарачэнняў), раёна, вобласці, назвы конкурсу і тэмы працы, інфармацыі аб аўтару работы (прозвішча, імя, імя па бацьку, клас/аб’яднанне па інтарэсах/група навучання) і аб кіраўніку/кіраўніках (прозвішча, імя, імя па бацьку (без скарачэнняў), пасада), а таксама нумары кантактных тэлефонаў кіраўніка.

**4. Падвядзенне вынікаў конкурсаў Акцыі**

Пераможцы і прызёры конкурсаў Акцыі вызначаюцца ў кожнай намінацыі і ўзроставай катэгорыі згодна з парадкам правядзення адпаведнага конкурсу.

Пераможцы і прызёры абласных этапаў конкурсаў Акцыі ўзнагароджваюцца дыпломамі галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама.

Пры падвядзенні вынікаў конкурсаў Акцыі пры роўнай колькасці балаў на падставе рашэння журы можа ўсталёўвацца адпаведная колькасць прызавых месцаў (першае, другое, трэцяе).

Пераможцы і прызёры заключнага этапу конкурсаў Акцыі ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, дыпломамі Рэспубліканскага цэнтра.

**5. Фінансаванне конкурсаў Акцыі ажыццяўляецца:**

на першым, другім, трэцім этапах – ва ўстаноўленым парадку за кошт сродкаў мясцовага бюджэту, якія выдзяляюцца на цэнтралізаваныя мерапрыемствы ў галіне адукацыі, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам;

на чацвёртым (заключным) этапе – ва ўстаноўленым парадку за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, якія выдзяляюцца на цэнтралізаваныя мерапрыемствы ў галіне адукацыі, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Камандзіровачныя выдаткі педагогам і праезд удзельнікаў мерапрыемстваў заключнага этапу адпаведнага конкурсу Акцыі ажыццяўляецца за кошт накіроўваючай арганізацыі.